Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

№ 3 (434)

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

Серада 1 лютага 1961 г.

Цана 1 кап.

## Нашы таварышы



Гэтага сціплага юнака добра ведаюць не толькі на юрыдычным факультэце. Актыўна ўдзельнічаючы ў грамадскім жыцці, Аляксандр Кароль не забываецца і аб вучобе. На ўсіх экзаменацыйных сесіях (а іх ўжо дзевяць за спіной) ён атрымлівае добрыя і выдатныя адзнакі.

Шмат часу Аляксандр аддае стралковаму спорту. Крок за крокам павышаючы сваё майстэрства, ён пераступіў нарматыў I спартыўнага разраду.

У гэтым годзе юнак заканчвае юрыдычны факультэт. Ведаючы Аляксандра, можна ўпэўнена сказаць: ён будзе добрым юрыстам.

НА ЗДЫМКУ: Аляксандр Кароль.

Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

### Здаюць тыя, хто працуюць і вучацца

# НІ ПУХА, НІ ПЯРА!

☆ ☆ ☆

## Не апусцелі аўдыторыі...

ЗДАЛІ апошні экзамен студэнты стацыянара. Яны ўжо раз'ехаліся ў розныя куткі рэспублікі—у свае родныя гарады і вёскі. Пачалася вясёлая пара—студэнцкія канікулы.

Але не апусцелі аўдыторыі ўніверсітэта. За сталы цяпер селі завочнікі. Сёння вы іх убачыце ўсюды—у чытальнай зале, у бібліятэцы, у кабінетах і аўдыторыях. Ім, вядома, цяжэй вучыцца: трэба працаваць і ў той жа час не забывацца пра кнігу. Але, нягледзячы на цяжкасці, многія добра здаюць залікі, выдатна адказваюць на экзаменах.

Зімовая экзаменацыйная сесія ў завочнікаў пачынаецца па-рознаму. Крыху раней прыязджаюць юрысты, пазней—філолагі і гісторыкі. Адпаведна размяркоўваюцца ў іх залікі і экзамены.

У юрыстаў сесія пачалася 21 студзеня, у гісторыкаў—праз нядзелю. Але як юрысты, так і гісторыкі амаль адначасова пачалі здаваць залікі і экзамены.

СТУДЭНТЫ першага курса юрыдычнага факультэта здавалі 27 студзеня аж чатыры экзамены: палітэканомію, логіку, нямецкую і латынскую мовы. У пяці груп першакурснікаў экзамены прымалі выкладчыкі юрыдычнага факультэта тт. Рагоўскі, Казакевіч, Сакалоўскі, Мельцэр.

— Завочнікі—народ талковы, дапытлівы... У будучым многія з іх будуць добрымі юрыстамі, — гавораць экзаменатары.

У МІНУЛУЮ нядзелю сесію «размачылі» гісторыкі. У гэты дзень студэнты другога курса здавалі залік па гісторыі старажытнага свету, а ў 24-й аўдыторыі хімічнага корпуса старшы выкладчык Ніна Антонаўна Гусакова разам з асістэнтам Ліфшыцам прымала экзамен па гісторыі сярэдніх вякоў у трэцякурснікаў.

Мы пабывалі на гэтым экзамене. Ля ўваходу ва аўдыторыю шмат ваенных—яны набываюць грамадзянскую прафесію. І гэта так знамянальна!

Старшына Уладзімір Задзеркоўскі ўсміхаецца:

— Так, пытаюцца вельмі доўга і дакладна. Адразу пазнаюць, што ведаеш, а чаго не.

Уладзіміру Задзеркоўскаму цяпер можна жартаваць—экзамен здадзены добра. А вось яго сусед капітан Любамірскі не можа гэтым пахваліцца: у ягонай заліковай кніжцы па гэтаму прадмету «здавальняюча».

Адказвае капітан Іван Капоця. Гаворыць ён разважліва, упэўнена, але ...недакладна. Капітан, што называецца, плавае. Адно за другім сыплюцца пытанні. Выкладчыкі патрабуюць ведання дат гістарычных падзей, імён выдатных дзеячоў.

— Цяжкія вельмі ўсе прозвішчы,—скардзіцца ён.

Уздыхае Ніна Антонаўна, хмурыцца асістэнт. Урэшце, яны ставяць у заліковай кніжцы «здавальняюча». Капітан разгублена ўсміхаецца...

На наступны дзень гэты экзамен працягваўся — здавалі ж больш 60 чалавек!

* * *

Мы расказалі толькі аб некаторых групах завочнікаў. Трэба дадаць, што ў гэтыя дні здаюць экзамены і залікі студэнты-завочнікі ўсіх факультэтаў.

Не пусцеюць аўдыторыі, не спыняецца праца выкладчыкаў. Універсітэт куе свае кадры.

Р. ЗАЛЕСКІ.

## ДАРОГА ДА ПРЫЗВАННЯ

*Вясёлым, гаманлівым гуртам выбягалі яны з дзвярэй вучылішча. Здавалася, і сонца свяціла ў гэты дзень незвычайна ласкава, і ўсё навокал было такім прыгожым! А ім хацелася спяваць, хацелася крыкнуць, каб пачулі ўсе:*

*— Я скончыў вучылішча! Я—рабочы!*

*Выпускнікі Мінскага рамеснага вучылішча ехалі ў Слонім, Браслаў і іншыя гарады і пасёлкі, дзе іх чакалі ў раённых друкарнях. Пры размеркаванні Мікалай Мотуз папрасіў, каб яго накіравалі ў Пухавічы. Камісія не пярэчыла...*

*Загадчык друкарні быў рад папаўненню. Ён завёў хлапца ў друкарскі цэх:*

*— Вось твая машына. Будзеш друкаваць газету.*

*Так пачаў працаваць Мікалай у Пухавіцкай раённай друкарні. Але ён не толькі друкаваў газету. Юнак стаў актыўным яе карэспандэнтам.*

*Аднойчы, наведаўшы сваякоў у калгасе, ён зацікавіўся работай маладых жывёлаводаў. Мікалай доўга гутарыў з імі і прывёз у рэдакцыю неблагі матэрыял. Матэрыял спадабаўся супрацоўнікам і быў надрукаваны ў газеце. З таго часу ўсё часцей і часцей ён браўся за аловак.*

*А неўзабаве Мотуз перайшоў у штат рэдакцыі, стаў літаратурным супрацоўнікам. Гэта работа нялёгкая, тым больш у раённай газеце. Цяжка было спачатку, але дапамаглі старэйшыя таварышы. У тым жа годзе Мікалай паступіў на аддзяленне журналістыкі завочнага факультэта.*

*Нахадзіўшыся за дзень па палях і фермах, не хочацца брацца за кнігу. Хочацца прылегчы, заплюшчыць вочы і не думаць ні аб чым. Але вучоба не чакае! І Мікалай схіляецца над сталом...*

*Ляцяць дні, месяцы, гады. Сёння вы можаце сустрэць ва ўніверсітэце высокага чарнавалосага юнака з выразнымі чорнымі вачыма. Гэта Мікалай Мотуз. Ён ужо студэнт трэцяга курса, здае залікі і экзамены.*

*Свой першы залік у гэтай экзаменацыйнай сесіі—па гісторыі беларускай мовы і літаратуры—ён здаў паспяхова. Уперадзе яшчэ тры залікі і экзамен. Я ўпэўнены, што і іх Мікалай Мотуз здасць паспяхова. Таму што ён прыйшоў на аддзяленне журналістыкі не выпадкова. Сюды яго прывяло прызванне.*

А. ЗАЛЕЎСКІ.



Журналіст прыйшоў у цэх.

Фотаэцюд В. АНЦЫФЕРАВА.

### ЛЕКЦЫІ, ДАКЛАДЫ ДЛЯ ПРАЦОЎНЫХ

## Вучоныя едуць у раёны

25 студзеня група навуковых работнікаў нашага ўніверсітэта выязджала ў Крупскі раён. Мэта паездкі—чытанне лекцый і дакладаў. А тэмы іх былі самымі разнастайнымі.

Д. П. Жмуроўскі выступіў з дакладам аб рашэннях студзеньскага Пленума ЦК КПСС. У зале прысутнічала 215 рабочых саўгаса «Бобр».

На харчкамбінаце аб выніках Маскоўскай нарады прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партый расказаў Н. Г. Круцько.

Паэты А. А. Лойка і Н. С. Гілевіч выступілі перад вучнямі беларускай і рускай школ з дакладамі аб сучаснай беларускай літаратуры.

З задавальненнем праслухалі працоўныя даклады аб савецкім заканадаўстве, аб прымяненні электронных вылічальных машын у народнай гаспадарцы, аб паходжанні рэлігіі, аб тэхнічным прагрэсе на сучасным этапе, якія былі прачытаны навуковымі супрацоўнікамі ўніверсітэта А. А. Галаўко, Н. А. Лепяшынскім, Г. М. Ліўшыцам, Н. А. Яравіковым.

Усяго ў гэты дзень на лекцыях і дакладах прысутнічала больш 1000 чалавек.

* * *

27 студзеня ў Лагойскі раён выязджала другая група вучоных універсітэта ў складзе 16 чалавек. З дакладамі выступілі тт. Парашкова, Гусеў, Базылеў, Зазека і іншыя.

## Па цікавых маршрутах

Днямі чатырнаццаць турысцкіх груп пакінулі сцены ўніверсітэта. Трынаццаць груп пройдуць па дарогах нашай рэспублікі, а больш вопытныя і вынослівыя турысты адправіліся на поўнач—на Кольскі паўвостраў.

За час паходаў студэнты выступяць з гутаркамі і дакладамі, яшчэ бліжэй пазнаёмяцца з жыццём і бытам рабочых, калгаснікаў і служачых. Яны раскажуць працоўным аб рашэннях студзеньскага Пленума ЦК КПСС, аб матэрыялах Маскоўскай нарады прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партый, пазнаёмяць слухачоў з гісторыяй нашага ўніверсітэта.

Усяго ў турысцкіх паходах знаходзіцца зараз больш 100 чалавек.

# Вершы М. КУЛІНКОВІЧА

Міхась Кулінковіч нарадзіўся ў 1934 годзе ў вёсцы Ляды, на Лагойшчыне. У 1954 годзе ён скончыў сярэднюю школу і пачаў працаваць літсупрацоўнікам Смалявіцкай раённай газеты «Ленінскі шлях». Вершы пачаў пісаць у 1952 годзе. Друкаваўся ў раённай газеце «Ленінскі шлях», у газетах «Мінская праўда» і «Чырвоная змена», у часопісах «Бярозка» і «Вожык».

Цяпер Міхась Кулінковіч — член Саюза журналістаў, загадчык аддзела сельскай гаспадаркі раённай газеты, студэнт-завочнік філалагічнага факультэта універсітэта. Сёння мы знаёмім нашых чытачоў з вершамі Міхася Кулінковіча.

### ПАСЛЯ ПАБЫЎКІ

Маці сына прытуліла блізка
Да грудзей і шэпча: «Дарагі!»,
Як калісь шаптала над калыскай,
Калі сноў баяўся ён благіх.

Сын таксама туліцца да маці:
«Родная, не трэба... Ну не плач...».
Ўсе, хто ёсць у гэты момант ў хаце,
Зычаць хлопцу поспехаў, удач.

Ды дарога кліча. Па-над вёскай
Ў вышыні курлычуць жураўлі.
І ў салдата светлаю палоскай
Промень сонца лёг на шынялі.

### А Я ВЯСЁЛЫ

*Цярушыць дождж. Прыгнуліся галінкі.*
*Не кружыць ліст сарваны ўгары—*
*Услалы ім дарогі і сцяжынкі.*
*Згубіла голас рэха у бары.*

*Пара асенняя. Навокал шэра.*
*І лёгкі сум заходзіць у душу.*
*А я вясёлы, рад, сябры, без меры:*
*Каханне ў сэрцы светлае нашу.*

### ЛЕТНІ ДЗЕНЬ

*З дрэў абабіўшы расу,*
*Сонца ступіла на ганак,*
*З дому паклікала серп і касу—*
*І зазвінеў летні ранак*
*Роем пчаліным, мовай людзей,*
*Рокатам моцных матораў....*
*Ведаю я: сённяшні дзень*
*З памяці выйдзе не скора.*

### НЕ ХАЧУ...

Не хачу свой лёс я раздзяляць
З лёсам трэскі, што плыве па моры:
У прыліў яе змагло сагнаць,
А прыгоніць к берагу не скора.

Лепш хачу рачною кропляй быць:
Не знікае век яна, не гіне.
А мільёны зліўшыхся такіх
Утвараюць акіян адзіны.

### БЯССМЕРЦЕ

Мір і працу любіць чалавек.
Гэта шчасце і жыццё яго.
Толькі вось бяда: кароткі век,
І не здзейсніш разам усяго.

Так, жыццё, нібы святло камет,
Загарыцца—згасне. Але верце:
На зямлі пакінеш добры след—
Значыць, ты знайшоў навек бяссмерце.

### ТРЫ ДАРОГІ

Марыў дзед аб вельмі многім:
Мець зямлю, дастатак ў хаце...
А пражыў свой век убогім
Пад дзяругай на палацях.

Бацьку выпаў лёс інакшы.
Ён з вінтоўкай у руках
Гора даўнішнюю чашу
Расплюскаў па ўсіх панах.

Я іду дарогай светлай
  У камунізма ясны дзень.
Мне ўсміхаецца прыветна
Шчасця сонечны прамень.



Студэнта V курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры Аляксандра Шыкаловіча часта можна бачыць у ціры са сваімі «выхаванцамі». З'яўляючыся інструктарам па стральбе з дробнакаліберкай вінтоўкі на сваім аддзяленні, Аляксандр не забываецца і аб павышэнні сваіх спартыўных вынікаў.

НА ЗДЫМКУ: Аляксандр Шыкаловіч трэніруецца страляць з дробнакаліберкага пісталета.

Фота **В. АНЦЫФЕРАВА.**

## Будзе чыста і ў юрыстаў

Вялікі прыгожы будынак на вуліцы Дзімітрава. Ён стаў для нас родным домам—гэта наш інтэрнат. Тут жывуць студэнты розных спецыяльнасцей—юрысты, гісторыкі, біёлагі, географы. Зайдзіце ў пакоі № 5, № 14, № 61, дзе жывуць студэнты юрыдычнага факультэта. Старасты гэтых пакояў Сергіенка, Мароз, Вадзянава пастаянна сочаць за парадкам. Адсюль і вынікі. Адкрыеш дзверы— і святлей, радасней становіцца на душы. Беласнежнымі пакрываламі засланы пасцелі, чыста вымыта падлога. На тумбачках акуратна разложаны канспекты, кнігі. Утульна і прыемна!

Але побач знаходзяцца пакоі, жыхары якіх забыліся, што такое парадак. Тут літаральна адзін раз у тыдзень праводзяць уборку. Брудна ў пакоях № 20 (староста Фецісаў), № 21 (староста Маладцоў), № 29 (староста Васілюк), № 34 (староста Радыёнаў), № 86 (староста Тарасенка).

Партыйнае і прафсаюзнае бюро юрыдычнага факультэта абмеркавалі пытанне аб захаванні правіл унутранага распарадку ў інтэрнаце. На пасяджэнне былі запрошаны старасты пакояў і члены студсавета. Адбылася сур'ёзная размова аб нашых недахопах.

Партбюро прапанавала студсавету выселіць з інтэрната студэнта IV курса Фецісава за сістэматычнае парушэнне правіл унутранага распарадку і антысанітарны стан пакоя № 20, старастам якога ён з'яўляецца. Астатнім жыхарам гэтага пакоя аб'яўлена вымова.

На пасяджэнні быў прынят выклік студэнтаў біялагічнага факультэта на спаборніцтва за ўзорную чысціню і парадак. Юрысты абавязаліся беражліва адносіцца да маёмасці, строга выконваць абавязкі дзяжурнага па інтэрнату.

У мэтах паляпшэння палітыка-выхаваўчай работы мы рашылі сістэматычна праводзіць сустрэчы са знатнымі людзьмі горада, старымі камуністамі, работнікамі літаратуры і мастацтва, арганізоўваць вечары адпачынку.

Наш інтэрнат павінен быць чыстым і ўтульным. І за гэта мы будзем змагацца. Я ўпэўнены, што мы даб'ёмся сваёй мэты.

**І. ШАЎЧЭНКА,**
**старшыня прафбюро юрыдычнага факультэта.**

# Вясёлая сумесь

### Каб не марнаваць часу

Томас Эдысон быў вядомы тым, што пастаянна што-небудзь вынаходзіў. На ягонай дачы была безліч прылад, якія маглі аблегчыць працу альбо сэканоміць час.

Аднойчы хтосьці з гасцяваўшых ў яго на дачы сяброў паскардзіўся, што ля ўваходу ў парк ёсць веснічкі, якія адчыняюцца вельмі цяжка.

— Мне давялося напружыць усе сілы, каб адчыніць іх,— сказаў госць.

— Зразумела,—адказаў Эдысон.—Адчыняючы веснічкі, вы накачалі ў рэзервуар на даху 30 літраў вады.

### Цудоўны дыпламат і сціплы чалавек

Амерыканскі вучоны Франклін быў першым амерыканскім паслом у Францыі.

Аднаго разу, седзячы на званым абедзе і не разумеючы, аб чым гаворыцца ў шматлікіх прамовах (Франклін французскай мовы не ведаў), вучоны, каб не паказацца няўважлівым, апладзіраваў, калі чуліся воплескі, і смяяўся, калі смяяліся іншыя.

Пасля адной прамовы ўсе прысутныя падняліся, пачуліся прывітальныя воклічы. Франклін стараўся не адстаць ад іншых. Якім жа было яго здзіўленне, калі ён заўважыў што ўвага ўсіх гасцей накіравана на яго, а прывітанні і воплескі змяніліся гучным смехам!

Франклін спытаў у суседа амерыканца, аб чым гаварылася ў гэтай прамове.

— У гэтай прамове гаварылася пра Вас,—адказаў сусед.—У ёй гаварылася, што Вы цудоўны дыпламат і вельмі сціплы чалавек.

# У пракуратуры і судзе

☆

**Л. СЯНЮТА,**
**студэнт 4-га курса юрыдычнага факультэта.**

☆ ☆

*—Лазоўская?—перапытаў сакратар гарсавета і з усмешкай дадаў:—А вы ведаеце, што іх у Заслаўлі каля пяцідзесяці набярэцца?*

*—Прыдзецца адрасы ўсіх і выпісаць,—сказаў я. Гэта была мая першая камандыроўка з Мінскай пракуратуры.*

*Сакратар гарсавета дастаў з шафы, поўнасцю забітай рознымі папкамі і справамі, кнігу ўліку жыхароў горада, і мы пачалі выпісваць сабе на лісток усіх жанчын Заслаўля з прозвішчам Лазоўская. Даныя, якія я меў, былі вельмі скупымі. Імя і імя па бацьку Лазоўскай былі невядомы. Вядома адно: ў лістападзе 1958 года яна заказвала ў швейнай майстэрні паліто карычневага колеру. Вось і ўсё. Але гэты факт быў важным сам па сабе, таму што ён праліваў святло на махлярскія дзеянні грамадзянкі Д., работніцы Заслаўскай швейнай майстэрні.*

*Да спісу Лазоўскіх прыйшлося дадаць яшчэ чатырох Ласоўскіх. Бо прозвішчы ж іх вельмі блізкія па гучанню. Праглядаю яшчэ раз адрасы ўсіх Лазоўскіх і Ласоўскіх. Дзе яны толькі не жывуць!— і на Набярэжнай, і на Першамайскай, і на Рабочай, і на Савецкай, і на вуліцы Луначарскага... З дапамогай сакратара гарвыканкома чарчу план вуліц горада, каб па парадку, не вяртаючыся, зайсці па ўсіх адрасах.*

*—Ніколі не шыла ў майстэрні,—заявіла першая Лазоўская.*

*— Шыла, але толькі ў канцы мінулага года,—адказала другая.*

*— Шыла плацце,—сказала трэцяя.*

*Чацвертая, пятая, шостая... І вось, нарэшце, тое, што трэба. Аказваецца, Ніна Васільеўна Лазоўская ўжо больш года не жыве ў Заслаўлі. Але ў 1958 годзе яна жыла тут у сваякоў, сваіх аднафамільцаў. Яна і шыла гэтае злашчаснае паліто.*

*...Памочнік пракурора Захараў, нягледзячы на тое, што час яго працы скончыўся, сядзеў у сваім кабінеце, яшчэ і яшчэ раз пераліствоў матэрыялы, чакаючы мяне. Вельмі важнай для яго была падсудная справа грамадзянкі Д., і ў сувязі з гэтым—мая паездка.*

*На наступны дзень сведка Ніна Васільеўна Лазоўская была ўжо ў нас, у пакоі следаваццеля, і давала каштоўныя паказанні.*

*Я расказаў толькі аб адной з маіх камандыровак. Нам, разам з Уладзімірам Якіменка, з якім я праходзіў практыку, нярэдка прыходзілася рабіць такія паездкі ў самыя розныя мясцовасці, высвятляць патрэбныя абставіны і дакументы. Мы рабілі допыты, праводзілі вочныя стаўкі, прад'яўлялі абвінавачванні, састаўлялі ўсе працэсуальныя дакументы. Работнікі пракуратуры А. Кульпановіч, І. Гарбачоў, А. Шынгель—былыя выпускнікі нашага факультэта— давяралі нам праводзіць многія важныя і адказныя аперацыі.*

*Некалькі слоў аб нашай практыцы ў нарсудзе.*

*У першы жа дзень нас поўнасцю загрузілі работай, даручыўшы выпісваць павесткі і выканаўчыя лісты. Гэта чыста тэхнічная работа. Але нікуды не дзенешся: у праграме практыкі прадугледжана, што кожны будучы юрыст павінен ведаць, як выпісваюцца павесткі, заводзяцца справы і г. д. За дзень мы павінны былі выпісаць каля 200 павестак кожны, таму працавалі ўзмоцненымі тэмпамі. Так прайшлі першыя два дні. Загружаны мы былі поўнасцю. А што гэта дало? Амаль нічога, акрамя ведання тэхнічнага боку спраў. У наступныя дні мы трапілі ўжо ў распараджэнне судовых выканаўцаў. Тут куды цікавей. Магчыма, часткова таму, што выканаўцы ўвялі нас ў курс справы, толкам расказалі, на што трэба звярнуць галоўную ўвагу, а што з'яўляецца толькі фармальным бокам. Работы з паперамі тут таксама многа. Аднак, калі робіш яе свядома—гэта карысна і цікава.*

*Дарэчы, аб арганізацыі практыкі. Нядрэнна было б, калі б замацаваныя за групамі выкладчыкі пабывалі разам са студэнтамі ў канцылярыях нарсуда, дапамаглі практыкантам разабрацца ва ўсёй шматлікай дакументацыі. Гэта не могуць зрабіць работнікі канцылярый, бо яны залішне загружаны работай і не заўсёды нават адказваюць на пытанні дапытлівых практыкантаў, часта даручаюць ім толькі чарнавую работу. А будучыя суддзі, між тым, павінны добра ведаць абавязкі кожнага з работнікаў нарсуда.*

*Разам са мною практыку праходзілі студэнты 4-га курса Іван Шаўчэнка, Васіль Кулага, Уладзімір Якіменка. З удзячнасцю мы будзем успамінаць народных суддзяў Н. І. Філатава, А. Д. Багдановіча, якія, нягледзячы на занятасць, заўсёды знаходзілі час, каб даць нам неабходныя заўвагі, тлумачэнні, практычныя парады.*

*За час практыкі прыйшлося нам сустрэцца і з даволі смешнымі, анекдатычнымі фактамі. Ды і нашы першыя крокі былі іншы раз недакладнымі і няўпэўненымі. Зараз, аглядваючыся назад, успамінаючы дні практыкі, мы неяк са здзіўленнем заўважылі, што адвыклі ад вучобы. Але ж прыдзецца прывыкаць. Уперадзе зноў заняткі ва ўніверсітэце, лекцыі, семінары...*

*Колькі задавальнення і радасці атрымаў кожны з нас за час практыкі! Выконваючы даручэнні народнага суддзі, следаваццеля, пракурора, мы заўсёды адчувалі, што ад нашай работы многае залежыць ў правільным вырашэнні судовых спраў, што частка нашай працы таксама ўкладзена ў справу барацьбы са злачыннасцю, з амаральнымі паводзінамі некаторых грамадзян.*

*І напэўна таму, што ў пракуратуры нам больш даручалі самастойных важных аперацый, практыка ў пракуратуры для нас была намнога цікавей і карысней, чым ў судзе.*

**Па слядах нашых выступленняў**

## „ЖРАЦЫ БАХУСА“

**Пад такім загалоўкам у нашай газеце ад 10 снежня 1960 г. быў змешчан фельетон. Як паведаміла рэдакцыі старшыня прафсаюзнага бюро хімічнага факультэта Т. А. Бальшова, факты, пададзеныя ў фельетоне, пацвердзіліся. Прафсаюзнае бюро хімфака сумесна з прадстаўнікамі партыйнага бюро і дэканата асудзілі недастойныя паводзіны малодшых навуковых супрацоўнікаў Г. І. Самаля і І. Ф. Кананюка.**

**Ім вынесена вымова, а таксама ўказана на недапушчальнасць падобных паводзін у далейшым.**


Нам. рэдактара **Р. ПЛАТОНАЎ.**

НАШ АДРАС:
**Мінск,**
**Універсітэцкі гарадок,**
**біякорпус, 31;**
**Тэлефон: 2-07-19.**
**Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна.**

АТ 06257. Зак. 357.